Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (547)) Субота, 21 снежня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

## ТРЫВОЖНАЕ СТАНОВІШЧА НА 2 КУРСЕ ФІЗФАКА

Праслухаўшы справаздачы камсоргаў другога курса фізічнага факультэта Патрына (аддзяленне агульнай фізікі) і Скарабагатава (аддзяленне радыёфізікі і электронікі) на пасяджэнні камітэта камсамола, у якіх разглядаўся стан акадэмічнай работы на курсе, можна было падумаць, што мінулагоднія факты сёлета не паўтараюцца. Здавалася, што атрыманыя ў летнюю экзаменацыйную сесію 78 нездавальняючых адзнак насцярожылі студэнтаў і цяпер яны сур'ёзна рыхтуюцца да зімовай сесіі.

Але праверка паказала іншае. Студэнты вельмі дрэнна наведваюць заняткі. Так, за паўтара месяцы прапушчана каля двухсот гадзін без уважлівых прычын, у тым ліку Наважылавай — 34, Прытыцкай — 26, Полазавым—13. Камсамольская арганізацыя другога курса пакідае такія з'явы без увагі.

Многія студэнты маюць па 3—4 запазычанасці па лабараторных работах, але лічуць гэта як нешта не вельмі важнае. Патрын нават заявіў: «Запазычанасць за 3—4 работы — гэта не катастрафічнае становішча».

Заданні на дом выконваюцца таксама дрэнна. Пры праверцы выканання заданняў на дом па матэматычнаму аналізу студэнтамі 9-й групы выявілася, што шэсць студэнтаў не падрыхтаваліся без уважлівых прычын. Тэарэтычныя палажэнні слаба ведаюць многія студэнты групы.

Тое ж можна сказаць і пра падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў па курсу гісторыі КПСС. Адказы студэнтаў 12 групы нічым не адрозніваліся ад адказаў школьнікаў. А 12-я ж група лічыцца лепшай на курсе! Студэнты, акрамя падручніка, не выкарыстоўваюць іншую літаратуру па таму ці іншаму пытанню ў ходзе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў. Канспектамі яны таксама не могуць карыстацца, бо іх проста не вядуць. Звычайна пішуць канспекты толькі тыя студэнты, што сядзяць на першых радах. Ствараецца ўражанне, што пішуць яны для перастрахоўкі, а не для лепшага ўразумення таго ці іншага пытання.

Мала чаго добрага можна сказаць і аб адносінах студэнтаў другога курса да вывучэння замежнай мовы. Не бачна іх у кабінетах гісторыі КПСС, замежных моваў.

Партыйная арганізацыя другога курса фізічнага факультэта не рэагуе на трывожныя сігналы аб становішчы на курсе. Больш таго, некаторыя камуністы самі аказаліся ў радах адстаючых. Сам сакратар партгрупы Паромчык без уважлівых прычын прапусціў 6 гадзін. Не здалі некаторых лабараторных работ Карповіч (сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта) і Скарабагатаў.

Дэканат факультэта, у сваю чаргу, мала клапоціцца аб падрыхтоўцы студэнтаў да зімовай экзаменацыйнай сесіі. Дагэтуль на другім курсе няма куратараў акадэмічных груп. А студэнтам жа, многія з якіх прыйшлі ва універсітэт прама са школы, дапамога куратараў зусім неабходна.

І ў першую чаргу павінны змяніць свае адносіны да вучобы і да падрыхтоўкі да сесіі самі студэнты другога курса фізфака.

Іван АКІНЧЫЦ.

## Зварот в'етнамскай інтэлігенцыі

«Людзі добрай волі ва ўсім свеце, і ў прыватнасці інтэлігенцыя, могуць аказаць нашаму паўднёвав'етнамскаму народу каштоўную дапамогу, садзейнічаць скарачэнню тэрмінаў вайны, прымусіць амерыканскія ваяўнічыя элементы спыніць сваё ўмяшацельства ў Паўднёвым В'етнаме і прадаставіць народам Паўднёвага В'етнама свабодна рашыць свой лёс», — гаворыцца ў звароце «Камітэта барацьбы супраць праследавання інтэлігенцыі Паўднёвага В'етнама амерыканскімі імперыялістамі і іх памагатымі». Гэты зварот адрасаваны інтэлігенцыі ўсіх краін свету ў сувязі з трэцяй гадавінай аснавання Нацыянальнага фронта барацьбы за вызваленне Паўднёвага В'етнама.

Сёння ў 19 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца вечар калектыву універсітэта, прысвечаны гэтай даце.

## РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ НАСЦЕННАЙ ГАЗЕТЫ «ЗА МІЧУРЫНСКУЮ БІЯЛОГІЮ»

У сувязі з выхадам юбілейнага 150-га нумара насценнай газеты біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію» горача віншуем рэдакцыйную калегію газеты.

За 15 гадоў свайго існавання насценная газета «За мічурынскую біялогію» стала добрым памочнікам партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый і дэканата факультэта ў барацьбе за глыбокія веды студэнтаў, за поспехі ў навукова-даследчай і выхаваўчай рабоце. Яна карыстаецца заслужаным аўтарытэтам ва ўсім універсітэце, служыць прыкладам для іншых насценных газет. Высокая ідэйнасць, мэтанакіраванасць, злабадзённасць, прынцыповая крытыка — вось што характэрна для выступленняў насценнай газеты.

Жадаем рэдакцыйнай калегіі газеты «За мічурынскую біялогію» новых поспехаў у высакароднай творчай рабоце.

Партыйны камітэт. Камітэт ЛКСМБ.
Рэктарат. Мясцовы камітэт.
Рэдакцыя газеты «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ».

## ПЕРАД СТАРТАМ IV УСЕСАЮЗНЫХ СТУДЭНЦКІХ ГУЛЬНЯЎ

В. П. ШАПЯЛЕВІЧ,
загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Фізічнае выхаванне стала неад'ёмнай часткай навучэння і выхавання студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Яно з'яўляецца сродкам умацавання іх здароўя, актыўнага адпачынку, павышэння і захоўвання працаздольнасці, падрыхтоўцы да працы і абароны Радзімы.

Ва універсітэце грамадскасць і кафедра фізічнага выхавання і спорту вядуць вялікую работу па ўмацаванню здароўя і ўдасканаленню спартыўнага майстэрства студэнтаў.

Спартыўны калектыў універсітэта налічвае ў сваіх радах звыш 3 тысяч студэнтаў і з'яўляецца адным з вядучых сярод вну нашай рэспублікі.

Звыш 2,5 тысячы студэнтаў рэгулярна займаюцца ў спартыўных секцыях па 24 відах спорту. Найбольш масавымі відамі спорту ў нас ва універсітэце з'яўляюцца валейбол, баскетбол, лёгкая атлетыка, барацьба, цяжкая атлетыка, спартыўная гімнастыка. Масавае развіццё ва універсітэце атрымалі турызм і шашкі.

Толькі за 1963 год пяць нашых студэнтаў сталі майстрамі спорту СССР, 60 студэнтаў—спартсменамі першага разраду, 720 студэнтаў выканалі нарматывы 2 і 3 разрадаў. 56 студэнтаў з'яўляюцца членамі зборных каманд Беларусі і рэспубліканскага Савета СДСТ «Буравеснік».

Многія студэнты ўмела спалучаюць добрую вучобу з заняткамі спортам. Напрыклад, І. Неманава (5 курс фізфака), У. Антанѐвіч (5 курс матфака), Я. Емяльянаў (5 курс хімфака), М. Талочка (4 курс матфака), В. Бялоў (4 курс фізфака), В. Стронгін (5 курс фізфака) і іншыя, выдатна займаючыся, дасягнулі высокіх вынікаў у спорце, а Антанѐвіч і Емяльянаў выканалі нарматывы майстра спорту СССР.

Добра папрацаваў спартыўны калектыў універсітэта сёлета. але яшчэ большыя задачы стаяць перад ім у будучым годзе. Са студзеня па ліпень 1964 года Белсавет СДСТ «Буравеснік» праводзіць VIII рэспубліканскую спартакіяду студэнтаў па 18 відах спорту. Пераможцы ў кожным відзе спаборніцтваў атрымаюць права абараняць гонар рэспублікі на IV Усесаюзных летніх студэнцкіх гульнях, якія будуць праводзіцца ў ліпені 1964 года ў Рызе.

Ацэньваючы вынікі выступленняў нашых каманд у папярэдніх спаборніцтвах, можна з упэўненасцю сказаць, што спартыўны калектыў універсітэта мае вялікія магчымасці паспяхова выступіць у рэспубліканскай спартакіядзе і заваяваць права выступаць па многіх відах спорту на студэнцкіх гульнях.

На першынствах Мінска сярод каманд вну добрую спартыўную падрыхтоўку паказалі нашы зборныя каманды па баскетболу (жанчыны), валейболу (мужчыны), ручному мячу, спартыўнай гімнастыцы, лёгкай атлетыцы, веласпорту, плаванню (мужчыны) і іншых відах спорту. Добра рыхтуецца да спаборніцтваў малады калектыў па мастацкай гімнастыцы. Можна з упэўненасцю сказаць, што гэтыя калектывы будуць у ліку першых прэтэндэнтаў на паездку на IV Усесаюзныя летнія студэнцкія гульні. Толькі шляхам упартых трэніровак можна дасягнуць жадаемых вынікаў, і большасць студэнтаў, членаў зборных каманд універсітэта па відах спорту рэгулярна працуе над павышэннем свайго спартыўнага майстэрства.

Аднак становішча спраў у некаторых камандах выклікае вялікую трывогу за паспяховае выступленне іх у спартакіядзе. Дрэнна трэніруюцца члены зборнай каманды па валейболу Р. Гарбунова (4 курс матфака), М. Тарасевіч (4 курс біяфака), зусім спыніла трэніроўкі Н. Захарава (5 курс матфака), а гэта ж асноўныя ігракі каманды, якая ў VII спартакіядзе студэнтаў была чэмпіёнам таварыства.

Слабую тэхнічную падрыхтоўку маюць зборныя па класічнай барацьбе, плаванню (жанчыны) і па лыжнаму спорту. З-за адсутнічання залы барацьбы каманды па класічнай і вольнай барацьбе не маюць неабходных умоў для добрай арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу.

Дрэннае выступленне асобных зборных каманд можа адмоўна адбіцца на комплексным заліку нашага калектыву ў VIII рэспубліканскай спартакіядзе студэнтаў. Да старта яе застаецца нямногім больш двух месяцаў. Неабходна, каб усе члены зборных каманд максімальна выкарысталі застаўшыся час для павышэння свайго спартыўнага майстэрства.

З мэтаю паляпшэння арганізацыі спартыўна-масавай работы на факультэтах і лепшай падрыхтоўкі зборных каманд да рэспубліканскай спартакіяды студэнтаў і IV Усесаюзных студэнцкіх гульняў кафедра фізвыхавання і спорту і спартыўны клуб у гэтым навучальным годзе праводзяць XII агульнауніверсітэцкую спартакіяду па 24 відах спорту і XI агляд-конкурс на лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай работы на факультэце. Гэтыя мерапрыемствы ў значнай ступені ўзнялі зацікаўленасць студэнтаў у паляпшэнні арганізацыі спартыўна-масавай работы на факультэтах.

Кафедра фізвыхавання і спорту выказвае ўпэўненасць, што партыйныя і грамадскія арганізацыі універсітэта і факультэтаў дапамогуць спартыўнай грамадскасці ліквідаваць маючыяся недахопы ў арганізацыі і падрыхтоўцы зборных каманд да спаборніцтваў, якія адбудуцца ў 1964 годзе.

## Юнацкая матэматычная

Бурнае развіццё навукі і тэхнікі, такое характэрнае для нашага часу, патрабуе вялікай колькасці спецыялістаў высокай кваліфікацыі і самых розных прафесій. З кожным годам усё большае значэнне набывае матэматыка — адна з самых важных навук, створаных чалавекам. Ужо цяпер матэматычныя веды патрэбны ў самых розных галінах навукі. Раскрыццё тайн матэматыкі—гэта адна з асноўных задач, што стаяць перад навукай.

Адзак гэтая задача пад сілу не ўсякаму. Толькі найбольш падрыхтаваныя, працалюбівыя, здольныя, таленавітыя матэматыкі могуць узяць у яе нейкую частку яе тайн.

Таму не выпадкова, што меняавіта матэматыкі, а не прадстаўнікі іншых навук, з'явіліся ініцыятарамі своеасаблівага руху па выяўленню найбольш здольных да матэматыкі вучняў, па ўцягненню моладзі да сур'ёзных заняткаў матэматыкай.

Характэрнай асаблівасцю матэматыкі, як, дарэчы, і музыкі, з'яўляецца тое, што схільнасці да яе пачынаюць праяўляцца, як правіла, у ранніх узросце. Заўважыць, развіць гэтыя здольнасці, вырасціць таленавітага вучонага — менавіта гэтую мэту ставяць перад сабой многія нашы вучоныя і настаўнікі. Гэтай мэце служаць таксама школы юных матэматыкаў, якія з'явіліся ў нашай краіне параўнаўча нядаўна

Першая такая школа была створана ў г. Іванаве ў 1957 годзе, дзе ў той час працаваў адзін з буйнейшых сучасных матэматыкаў акадэмік А. І. Мальцаў. Неўзабаве такія ж школы ўзніклі ў Маскве, Ленінградзе і ў іншых гарадах. У цяперашні час вялікая работа праводзіцца таксама ў Новасібірску.

У нас, у БДУ, пры матэматычным факультэце на працягу многіх год працавалі матэматычныя гурткі для школьнікаў горада Мінска. Сёлета на базе гурткоў была створана школа юных матэматыкаў.

На якіх прынцыпах пабудавана яе работа і чаму ўзнікла неабходнасць у яе стварэнні? Трэба адзначыць, што гурткі адыгралі вялікую ролю ў выяўленні здольных вучняў. Дастаткова ўказаць, што большасць нашых лепшых студэнтаў у розны час займалася ў гуртках пры універсітэце, а потым актыўна ўдзельнічала ў кіраўніцтве імі. Аднак, бадай, самым галоўным недахопам гурткоў было тое, што не іспавала адзінай праграмы навучання і цвёрда ўсталяванай арганізацыі. Па сутнасці, уся работа, не лічачы невялікай колькасці лекцый, зводзілася да рашэння цікавых і даволі складаных задач, якія выбіраліся кіраўнікамі згодна іх густу і схільнасцяў. Недахопы такой работы зусім відавочны.

Сёлета на матэматычным факультэце была створана спецыяльная камісія па выпрацоўцы праграмы школы юных матэматыкаў і падбору выкладчыкаў.

Было рашана заняткі ў школе праводзіць па чатырох секцыях: 8, 9, 10, 11 класы. Адпаведна былі складзены праграмы для кожнага класа з улікам матэматычнай падрых-

(Заканчэнне на 2 стар.)

## У гасцях у воінаў

*На ўсё жыццё застанецца ў памяці ў маладых салдат энскай часці мінулы нядзельны дзень. У гэты дзень яны прымалі прысягу. Каб павіншаваць іх са святам пасвячэння ў салдаты і даць канцэрт, да іх прыехалі ў госці лепшыя прадстаўнікі універсітэцкай мастацкай самадзейнасці.*

*З захапленнем былі сустрэты фельетоны студэнта 3 курса аддзялення журналістыкі Міхася Знака, танцы ў выкананні калектыву філалагічнага факультэта пад кіраўніцтвам Віктара Асаулава, вершы універсітэцкіх паэтаў.*

*Гарачымі апладысментамі ўзнагародзілі воіны Сашу Ровіну, Аду Булацкую, Анатоля Каліціёўскага, Мірона Бобера, Аляксандра Працкевіча, Івана Скацкевіча, Люду Камашэнкаву і іншых.*

*Каля двух гадзін ішоў канцэрт. Салдаты доўга і сардэчна дзякавалі ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці, перадавалі прывітанне ўсім студэнтам універсітэта і пажадалі ім поспехаў у зімовай экзаменацыйнай сесіі.*

*Юрый САПАЖКОЎ,*
*студэнт 2 курса адДз. журналістыкі.*

